1. Назавіце асаблівасці геаграфічнага становішча вобласці. 2. У чым асаблівасць сельскага рассялення вобласці і чаму? 3. Якая спецыялізацыя прамысловасці Брэсцкай вобласці?

4. Як будзе змяняцца спецыялізацыя сельскай гаспадаркі вобласці ў сувязі з пацяпленнем клімату? 5. Якія новыя галіны прамысловасці найбольш перспектыўныя ў вобласці?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Складзіце калаж з этыкетак прадукцыі, якая з'яўляецца брэндам вобласці. 2. Падрыхтуйце паведамленні або мультымедыйныя прэзентацыі пра гарады вобласці.

# § 45. Віцебская вобласць

***Узгадваем.*** *З чым звязаны асаблівасці прыродных умоў і прыродных рэсурсаў Віцебскай вобласці? Як змяняўся АТП Віцебскай вобласці ў савецкі час?*

**Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Па велічыні валавога рэгіянальнага прадукту Віцебская вобласць пераўзыходзіць толькі Магілёўскую вобласць. Удзельная вага ВРП складае 7,9 % ад рэспубліканскага. На долю прамысловасці прыходзіцца 33,1 % ВРП Віцебскай вобласці (мал. 174).




Мал. 174. Структура ВРП Віцебскай вобласці, %

**Геаграфічнае становішча.** Віцебская вобласць займае паўночную частку Беларусі на мяжы з Літвой, Латвіяй і Расіяй. Тут знаходзіцца самы паўночны пункт краіны. Плошча вобласці — 40,1 тыс. км$^2$ (3-е месца пасля Гомельскай і Мінскай). Тэрыторыю вобласці перасякаюць транс'еўрапейскія транспартныя калідоры, магістральныя нафтаправоды і нафтапрадуктаправоды, даволі шмат памежных пераходаў і лагістычных цэнтраў. Усё гэта падкрэслівае выгаднасць яе эканоміка-геаграфічнага становішча.

**Прыродныя рэсурсы.** У вобласці мала карысных выкапняў. У асноўным яны звязаны з чацвярцічнымі адкладамі: радовішчы цагельных і цэментных глін, будаўнічага пяску, пясчана-жвіровага матэрыялу. Каля Віцебска распрацоўваецца радовішча даламітаў Руба. *Да якіх адкладаў прымеркавана радовішча?* У азёрах утварыліся радовішчы сапрапеляў, на месцы былых азёр — радовішчы торфу.

Сельскагаспадарчыя землі займаюць менш за 37 % тэрыторыі — адзін з найменшых паказчыкаў. Для вобласці характэрна максімальнае ў краіне распаўсюджанне дзярнова-падзолістых забалочаных суглінкавых глеб

(больш за 50 %). Віцебская вобласць горш за іншыя вобласці забяспечана агракліматычнымі рэсурсамі. Тут самы кароткі вегетацыйны перыяд, прахалоднае вільготнае лета, халодная і працяглая зіма, што стрымлівае сельскагаспадарчую вытворчасць.

Віцебская вобласць — адна з самых забяспечаных воднымі рэсурсамі. Большую яе частку займае басейн ракі Заходняя Дзвіна. Галоўнай рысай вобласці з'яўляецца наяўнасць на ўсёй тэрыторыі буйных азёр ледавіковага паходжання. У многіх месцах азёры ўтвараюць групы: Браслаўская, Ушацкая і інш.

Знайдзіце на карце атласа (с. 6–7, 16, 18, 62) рэкі і азёры, якія ўваходзяць у дзясятку буйнейшых па плошчы і самых глыбокіх у краіне.

Віцебская вобласць багатаяляснымі рэсурсамі. Лясістасць перавышае сярэднюю па краіне і складае 41,3 % (2-е месца пасля Гомельскай вобласці). Лясы размяшчаюцца нераўнамерна. Сярод балот шмат верхавых і пераходных. Прыродаахоўныя тэрыторыі займаюць 9,5 % плошчы вобласці. Тут знаходзяцца НП «Браслаўскія азёры», большая частка Бярэзінскага біясфернага запаведніка і частка НП «Нарачанскі», каля 100 заказнікаў і больш за 200 помнікаў прыроды.

**Насельніцтва.** Колькасць насельніцтва вобласці складае 1180,2 тыс. чалавек (4-е месца). 77 % насельніцтва пражывае ў гарадах. Шчыльнасць насельніцтва — самая нізкая ў Беларусі (30 чал./км$^2$). У Віцебскай вобласці самая высокая смяротнасць і найбольшае змяншэнне насельніцтва. Паводле нацыянальнага складу пераважаюць беларусы (85 %), на другім месцы — рускія (больш за 10 %).

**Прамысловасць.** Прадпрыемствы вобласці вырабляюць 14,6 % аб'ёму прамысловай прадукцыі краіны. Колькасць прамысловых прадпрыемстваў самая маленькая — каля 1100, у тым ліку каля 170 буйных і сярэдніх. Больш за 80 % прамысловай прадукцыі даюць Віцебск, Наваполацк, *Орша*.

Вядучае месца ў структуры апрацоўчай прамысловасці Віцебскай вобласці займае вытворчасць нафтапрадуктаў і хімічная прамысловасць (57 %). Галоўная галіна спецыялізацыі — нафтаперапрацоўка. Наваполацкі НПЗ вырабляе больш за палову прамысловай прадукцыі вобласці. Вобласць з'яўляецца адзіным вытворцам поліэтылену («Нафтан»), шкловалакна («Полацк-Шкловалакно»), вапнавай і даламітавай мукі; выпускае льняныя тканіны, хімічныя валокны і ніткі, пластмасавыя трубы, дываны, вырабляе каля 30 % электраэнергіі краіны.

Вытворчасць харчовых прадуктаў складае каля 20 % апрацоўчай прамысловасці вобласці — гэта мясная і малочная прадукцыя, а таксама малочна-кансерваваная прадукцыя (у г. Глыбокае). Машынабудаўнічыя

прадпрыемствы выпускаюць прамысловыя швейныя машыны, больш за палову металарэзных станкоў, тэлевізары. Тут шмат ільнозаводаў і адзіны ў краіне льнокамбінат у Оршы. У Віцебску вырабляецца больш за 90 % дываноў, амаль 50 % абутку Беларусі.

Віцебская вобласць вылучаецца па вытворчасці электраэнергіі. Лукомская ДРЭС з'яўляецца самай магутнай у краіне, а ў п. г. т. Арэхаўск (Аршанскі раён) працуе першая ў краіне Беларуская ДРЭС. Ва ўсіх буйных гарадах ёсць ЦЭЦ. Наваполацкая ЦЭЦ — найбуйнейшая ў вобласці. Даволі шмат ГЭС, у тым ліку буйнейшыя ў краіне Віцебская і Полацкая. На долю вытворчасці і размеркавання электраэнергіі прыходзіцца амаль 15 % прамысловай вытворчасці. Горназдабыўная прамысловасць прадстаўлена прадпрыемствамі па здабычы торфу і будаўнічых матэрыялаў, даламітаў у п. г. т. Руба.

Больш за 60 % прамысловай прадукцыі дае Наваполацк. Якія галіны прамысловасці размяшчаюцца ў Наваполацку і з якімі фактарамі звязана іх размяшчэнне менавіта тут?

**Структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** У структуры ВРП вобласці на долю сельскай гаспадаркі прыходзіцца каля 12 %. Вобласць спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, кормавытворчасці ў спалучэнні са збожжавай гаспадаркай, развітым ільнаводстве. У структуры пасяўных плошчаў найбольшыя плошчы (па 45 %) займаюць збожжавыя і кармавыя культуры. Сярод збожжавых вялікая доля ячменю і жыта. Тут найбольш спрыяльныя глебава-кліматычныя ўмовы для вырошчвання лёну і рапсу. Па вытворчасці льновалакна вобласць апярэджвае іншыя рэгіёны — 25 % прадукцыі, алейнага насення рапсу — амаль 20 %. Па валавой вытворчасці мяса і малака — па 12 % — займае апошняе і перадапошняе месца ў краіне. Крыху лепш развіта птушкагадоўля.

**Геаграфія сферы паслуг.** На долю галін нематэрыяльнай вытворчасці ў Віцебскай вобласці прыходзіцца крыху менш за 50 % ВРП. Па працягласці чыгунак (больш за 1200 км) і аўтамабільных дарог вобласць займае адно з першых месцаў у краіне, аднак па грузаабароце і аказанні транспартных паслуг — адно з апошніх. У грузаабароце вялікая роля трубаправоднага транспарту. Вядучай па аб'ёме ВРП галіной сацыяльна-бытавых паслуг выступае гандаль.

Даволі шмат аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы: пяць устаноў вышэйшай адукацыі, амаль 30 каледжаў і ліцэяў, 28 музеяў (лідзіруючае становішча ў краіне), больш за 4200 фізкультурна-спартыўных аб'ектаў. Асабліва вялікі рэкрэацыйны патэнцыял вобласці. Найбольш



Мал. 175. Сафійскі сабор, г. Полацк

вядомыя помнікі архітэктуры: Сафійскі сабор і Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр у Полацку, Ратуша і Палац губернатара ў Віцебску, касцёл Святой Ганны ў вёсцы Мосар, царква Раства Багародзіцы і Траецкі касцёл у Глыбокім і інш. (мал. 175). У вобласці развіты паляўнічы, спартыўны, аграэкалагічны, кулінарны і культурна-пазнавальны турызм, функцыянуе больш за 100 гасцініц і больш за 100 санаторна-курортных, аздараўленчых арганізацый.

Прааналізуйце карты атласа (с. 51–57) і знайдзіце аб'екты сферы паслуг.

**Буйнейшыя эканамічныя цэнтры вобласці. Віцебск** — адзін з самых старажытных гарадоў Беларусі (год заснавання 974) — размешчаны на рацэ Заходняя Дзвіна. Па колькасці насельніцтва (каля 370 тыс. жыхароў) ён займае 5-е месца ў краіне. З'яўляецца шматфункцыянальным цэнтрам. Найбольшую ўдзельную вагу ў структуры прадукцыі мае вытворчасць дываноў, абутку, тэлевізараў, гадзіннікаў. Выпускаюцца валакніста-аптычныя кабелі, лекі і іншая прадукцыя. Віцебск часта называюць культурнай сталіцай Беларусі. Тут працуе філармонія, два тэатры, у тым ліку адзін з найстарэйшых у краіне — Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа. Сусветную вядомасць атрымаў Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». У горадзе пяць устаноў вышэйшай адукацыі і іх філіялаў, спецыялізаваныя ліцэі і каледжы. Функцыянуе свабодная эканамічная зона «Віцебск».

Другі па велічыні горад вобласці — **Орша** (115 тыс. жыхароў). Гэты старажытны горад (заснаваны ў 1067 г.) мае вялікае транспартнае значэнне, паколькі ляжыць на скрыжаванні чыгуначных і аўтамабільных дарог. *Колькі напрамкаў чыгунак уключае Аршанскі чыгуначны вузел?* Шырока вядомая прадукцыя аршанскіх прадпрыемстваў машынабудавання, лёгкай і харчовай прамысловасці: металаапрацоўчыя станкі, ільняныя тканіны, мясныя кансервы, кансервы для дзіцячага харчавання, сыры. У горадзе шмат сацыяльных аб'ектаў. У Аршанскім раёне размешчаны п. г. т. Копысь — месца нараджэння першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.

**Наваполацк** (107,4 тыс. жыхароў) заснаваны ў 1963 г. недалёка ад Полацка ў сувязі з будаўніцтвам нафтаперапрацоўчага завода «Нафтан». Асноўная яго прадукцыя — нафтапрадукты, хімічныя валокны, палімеры этылену, вырабы з пластмасы. У маладым горадзе развіта сфера паслуг. На базе політэхнічнага інстытута ў 1993 г. заснаваны Полацкі ўніверсітэт.

**Знешнеэканамічныя сувязі.** Сярод важнейшых відаў экспартуемай прадукцыі Віцебскай вобласці — паліва мінеральнае, палімеры этылену, шкловалакно, абутак, хімічныя валокны і ніткі, правады і кабелі, нафтапрадукты, звадкаваны газ, прадукцыя малочнай прамысловасці, мяса і мясныя прадукты.

**Абагульнім і запомнім.** Віцебская вобласць дрэнна забяспечана агракліматычнымі рэсурсамі. У вобласці найбольшае натуральнае змяншэнне насельніцтва. Галіны спецыялізацыі — нафтаперапрацоўка і хімічная прамысловасць, вытворчасць электраэнергіі, ільняных тканін і дываноў. Віцебская вобласць валодае высокім рэкрэацыйным патэнцыялам тэрыторыі.

1. Якія геалагічныя падзеі аказалі ўплыў на прыроду Віцебскай вобласці? 2. Назавіце галіны спецыялізацыі прамысловасці вобласці.

3. Якія фактары абумовілі ўзнікненне самых старых і самых маладых гарадоў вобласці? 4. Якая спецыялізацыя прамысловасці Віцебскай вобласці? 5. Вызначце ўзаемасувязь паміж прыродна-кліматычнымі ўмовамі і спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі вобласці.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Выкарыстоўваючы дадатковы матэрыял, складзіце геаграфічны партрэт вобласці, вылучыўшы асноўныя прыродныя, сацыяльныя і эканамічныя характарыстыкі тэрыторыі.

## § 46. Гомельская вобласць

***Узгадваем.*** *Які рэгіён Беларусі з'яўляецца багацейшым на карысныя выкапні? Якая тэрыторыя больш за ўсё пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС?*

**Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Па ўдзельнай вазе валавога рэгіянальнага прадукту ў ВУП краіны (10,6 %) Гомельская вобласць саступае толькі Мінску і Мінскай вобласці. Тут засяроджана каля 20 % прамысловай вытворчасці краіны. На долю прамысловасці прыходзіцца амаль 37,9 % ВРП вобласці (мал. 176).




Мал. 176. Структура ВРП Гомельскай вобласці, %

**Геаграфічнае становішча вобласці.** Гомельская вобласць размяшчаецца на паўднёвым усходзе Беларусі і мяжуе з Расіяй і Украінай. Частка мяжы пасля аварыі на ЧАЭС апынулася ў межах зоны адчужэння.